# Голас Радзімы

№ 5 (2095)
2 лютага 1989 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.




Агульная плошча гэтага насценнага роспісу ў адной з мінскіх школ—160 квадратных метраў. Работа выканана ў двух ярусах. Верхні—як уверцюра, якая папярэднічае ўспрыняццю ўсёй кампазіцыі. Ніжні ярус — асноўны, ён складаецца з алегарычных карцін-дзеянняў, што раскрываюць больш канкрэтна сістэму сімвалаў верхняга. А выканаў усю гэту складаную работу Уладзімір Качан. Знаёмцеся з творчым партрэтам маладога мастака ў матэрыяле «Гледача выбіраю ў сааўтары».

НА ЗДЫМКАХ: мастак У. КАЧАН; фрагменты роспісу.







## ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ ВУЧОНАГА

# ЛЁС НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

Пераканаўшыся ў тым, што пры будаўніцтве сацыялізму немагчыма абаперціся на ваенны і палітычны энтузіязм, што патрэбны камерцыйны разлік, асабістая матэрыяльная зацікаўленасць, майстэрства гандляваць, Ленін, партыя сталі на шлях ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкі, прынятай X з'ездам РКП (б) у сакавіку 1921 года.

Цяжкасць пераходу ад перыяду ваеннага камунізму да новага этапу сацыялістычнага будаўніцтва заключалася ў скарачэнні ролі насілля ў кіраванні грамадствам. (Лагічным завяршэннем гэтага працэсу павінна была стаць поўная адмова ад насілля). На вырашэнне гэтай праблемы запатрабаваліся вялікія намаганні партыі і ў прафсаюзнай дыскусіі 1920—1921 гадоў, і ў прыняцці нэпа, і ў ходзе абмеркавання плана будаўніцтва сацыялізму.

Абагульняючы вопыт першых гадоў нэпа, Ленін пісаў: «Мы вымушаны прызнаць карэнную перамену ўсяго пункту гледжання нашага на сацыялізм». Але пасля смерці Леніна яго ідэі намаганнямі Сталіна, Зіноўева, Каменева і іншых былі прадстаўлены «як ідэі цяжка хворага правадыра». Акрамя таго, сёння сцвярджаецца, што і ў самім рэальным жыцці існавалі падставы для настойвання на «старым поглядзе» на сацыялізм, яго атаясамліванні з адміністрацыйна-камандпай сістэмай. Галоўная падстава —сацыялізму патрэбен цывілізаваны работнік, сфарміраваны дзесяцігоддзямі капіталістычнай вытворчасці, а такога к моманту Кастрычніцкай рэвалюцыі не было. Таму «кампенсатарам» недастатковасці агульнай культуры для будаўніцтва сацыялізму, на думку некаторых аўтараў, стала адміністрацыйна-камандная сістэма, яе метады кіраўніцтва грамадствам: насілле, прымус, «надзвычайшчына».

Склалася дзіўная сітуацыя: нас вярнулі сёння да палемікі паміж бальшавікамі і меншавікамі, партыямі II Інтэрнацыянала ў перадрэвалюцыйныя і першыя паслярэвалюцыйныя гады. Здавалася б, гэтыя спрэчкі былі завершаны ў артыкуле Леніна «Аб нашай рэвалюцыі», у якім ён пераканаўча даказаў неабгрунтаванасць пазіцыі сацыял-дэмакратыі. Назваўшы бясспрэчным сцвярджэнне «герояў II Інтэрнацыянала» аб тым, што «Расія не дасягнула такой вышыні развіцця вытворчых сіл, пры якой магчымы сацыялізм», Ленін указвае на крайнія абставіны, што вымусілі бальшавікоў узяць уладу. Ён адзначае, што адсталасць Расіі не з'яўляецца рашаючай перашкодай для пераходу да сацыялізму. «Калі для стварэння сацыялізму патрабуецца пэўны ўзровень культуры (хаця ніхто не можа сказаць, які менавіта гэты пэўны «ўзровень культуры», таму што ён розны ў кожнай з заходнееўрапейскіх дзяржаў), то чаму нам нельга пачаць з заваёў рэвалюцыйным шляхам передумоў для гэтага пэўнага ўзроўню, а потым ужо на падставе рабоча-сялянскай улады і савецкага ладу, рушыць даганяць іншыя народы». З гэтых слоў відаць, што «кампенсатарам» недастатковай цывілізаванасці, паводле Леніна, павінна была стаць рабоча-сялянская ўлада, якая пераўтварыла б вытворчыя адносіны ў сапраўды сацыялістычныя, а не ў казарменна-камуністычныя, і не рэжым асабістай улады.

Непрыманне новай ленінскай канцэпцыі сацыялізму было звязана з сур'ёзнымі адхіленнямі ад новай эканамічнай палітыкі, перш за ўсё —у дзяржаўнай вытворчасці. Паколькі трэстаўскі гасразлік, што дзейнічаў ў яе сістэме, быў на справе «гасразлікам для начальнікаў», а ўзаемаадносіны паміж рабочымі і адміністрацыяй рэгуляваліся не працай на канчатковы вынік, не гасразліковымі формамі, а традыцыйнай сістэмай норм, тарыфаў і расцэнак, пастолькі дзяржаўная прамысловасць па першым часе не магла існаваць без моцных адміністрацыйных падпорак. Новая эканамічная палітыка не пранікла на дзяржаўную вытворчасць. У выніку пралетарыят не стаў той сацыяльнай сілай, якая б трымалася і змагалася за нэп. Калі ж абвастрыліся сацыяльныя праблемы, узніклі харчовыя цяжкасці, рабочы клас падтрымаў дзеянні партыі, накіраваныя на ліквідацыю нэпа, на прымусовую калектывізацыю сялянства і раскулачванне яго больш ці менш заможнай, найбольш прадукцыйнай часткі, якая складалася ў абсалютнай большасці з працоўных-сераднякоў.

Між тым, нэп — палітыка, разлічаная на ўцягненне ў аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі і ў далейшае будаўніцтва сацыялізму працоўных мас, усіх класаў і слаёў, часткова нават сярэдняй буржуазіі, у якой сродкі вытворчасці ўжо былі нацыяналізаваны, але капітал у той ці іншай форме яшчэ заставаўся. Калі маёмную частку насельніцтва нэп уцягваў як бы аб'ектыўна (самім фактам удзелу ў наладжванні гаспадаркі і ўплаты падаткаў дзяржаве), то на большасць працоўнага насельніцтва ўздзеянне нэпа выяўлялася ў задавальненні асабістай матэрыяльнай зацікаўленасці праз наладжванне дробнай індывідуальнай гаспадаркі і рынычных адносін, а таксама праз кааперанне вытворчасці, забеспячэння, збыту, крэдытавання і да т. п. Бо з-за недастатковай эканамічнай магутнасці і вопыту гаспадарання кожнага з іх паасобку яны не маглі б выстаяць пры свабодным рынку ў барацьбе з маёмнымі прыватнікамі. Характэрна тое , што і ў першым, і ў другім выпадках адбывалася натуральнае спалучэнне асабістых інтарэсаў грамадзян з грамадскімі інтарэсамі, хаця, вядома, у першым выпадку асабістыя інтарэсы дамінавалі. Менавіта таму развіццё кааперацыі, падтрымка яе дзяржавай і забеспячылі б з часам **вычарпанне** гэтага боку нэпа. У другой жа яго частцы ён працягваў бы нармальна функцыяніраваць аж да поўнай пабудовы сацыялістычнага грамадства і пераходу яго да камунізму, гэта значыць да адмірання рынычных адносін з-за непатрэбнасці. Няправільна таму сцвярджаць, быццам нэп вычарпаў сябе. Няправільна хаця б таму, што сацыялізм, нават у самым лепшым — не тое што ў сталінскім — сваім выглядзе немагчымы без нэпа, паколькі ён праз грамадскую вытворчасць увогуле, і дзяржаўную асабліва, не ў стане задаволіць сваіх грамадзян прадметамі спажывання. Сацыялізм вымушаны, насуперак усёй сваёй «нянавісці» да прыватнага, індывідуальнага, папаўняць свае рэсурсы прадукцыяй індывідуальнай, прыватнай працы (па некаторых, асабліва важных відах да 70—80 працэнтаў неабходнай грамадству колькасці, а пра якасць і гаварыць няма чаго: яна намнога вышэйшая). А гэта выклікае неабходнасць мець дзеючы рынак. З нэпам здарылася тое, што звычайна здараецца з жыццёва важнымі з'явамі: калі іх выкідваюць у акно, яны да нас вяртаюцца праз дзверы і наадварот.

Нэп — не самагодная толькі ў сабе палітыка, яна непасрэдна і вельмі глыбока павінна была быць звязанай з кааперацыяй, якая б ахоплівала ўсю грамадскую вытворчасць. Тады матэрыяльная зацікаўленасць усіх вытворцаў, не будучы гарантаванай дзяржавай, была бы звязана з узаемаабменам прадукцыяй на пачатках гандлю, куплі-продажу. А калі адной частцы вытворцаў — рабочым — была дадзена такая гарантыя і ў зарплаце, і ў прадуктах (картачная сістэма з 1928 года), тады з'явілася сацыяльная база для праціўнікаў нэпа — бюракратаў, што складалі адміністрацыйна-камандную сістэму.

Натуральным вынікам адмаўлення прыняць ленінскую канцэпцыю сацыялізму як ладу цывілізаваных кааператараў было стварэнне і пастаяннае ўзмацненне адміністрацыйна-каманднай сістэмы, перанясенне яе ва ўсе сферы эканомікі, фактычнае яе адзяржаўленне з мэтай выключэння «ігры» эканамічных законаў свабоднага рынку, які з'яўляецца ўмовай існавання і развіцця сялянскай гаспадаркі. Любая цяжкасць (напрыклад, хлебанарыхтоўчая), якая ўзнікла ў сувязі з гэтым, выкарыстоўвалася сістэмай для ўціску сялянства, для абмежавання нэпа, а затым і канчатковага адмаўлення ад яго. Вось калі б нэп існаваў сам па сабе і з яго не вырастала б кааперацыя, тады б, сапраўды, ён першапачаткова нёс бы ў сабе самаадмаўленне — у выніку таго, што ён непазбежна прывёў бы да адраджэння капіталізму, «прод-кам» якога, як вядома, з'яўляецца дробнатаварная вытворчасць. Пралетарская дзяржава, натуральна, не магла б дапусціць такога развіцця нэпа і рана ці позна прыкрыла б яго. Што і зрабіў Сталін. Яму заставалася альбо паслядоўна праводзіць у жыццё сваю «альтэрнатыву», альбо вярнуцца да ленінскай канцэпцыі. Ён аддаў перавагу першаму. Хаця якраз злучэнне нэпа з кааперацыяй пазбаўляла ад такога развіцця, пры якім з дробнай вытворчасці нараджаецца капіталізм.

**Агдас БУРГАНАЎ,**
**кандыдат гістарычных навук, прафесар.**

## МАЛАДЫ РАБОЧЫ І АДУКАЦЫЯ

# ІДЭЯ ЗНАЙШЛА ПАДТРЫМКУ

Хачу спыніцца на адной з важных праблем выхавання моладзі — станаўленні рабочай змены і яе адукацыі. Як вырашаецца яна ў Савецкай краіне?

Сёння важнасць адукацыі для кваліфікаванага рабочага ўжо нікому не трэба даказваць. Разумеюць гэта і самі маладыя людзі, і іх педагогі, настаўнікі. Ужо не адно дзесяцігоддзе існуе ў краіне сістэма вячэрніх школ для працуючых юнакоў і дзяўчат. Яна неабходная сёння, але толькі гэтага ўжо мала. Наша жыццё вельмі дынамічнае, пастаянна мяняецца, патрабуе новых, сучасных форм арганізацыі адукацыі і самаадукацыі моладзі.

**На сёння ў БССР працуюць 160 вячэрніх (зменных) школ. На канец 1987/88 навучальнага года ў іх вучылася 31 тысяча маладых рабочых і служачых, 17 тысяч маладых людзей атрымалі атэстаты сталасці.**

**У гэтым годзе працягваецца актыўны працэс перабудовы вячэрніх школ. Так, сёння 9 такіх школ набылі статус цэнтраў агульнаадукацыйнай, прафесійнай і культурнай адукацыі моладзі.**

Адна з іх — стварэнне спецыяльных адукацыйных цэнтраў непасрэдна на вытворчасці. Там рабочы ў зручны час зможа праслухаць лекцыю па цікавых для яго пытаннях, пракансультавацца з тэхнічным спецыялістам, азнаёміцца з метадамі і спосабамі работы з навукова-папулярнай, навуковай і мастацкай літаратурай, афармленнем разнастайных дакументаў у сістэме тэхнічнай творчасці.

Натуральна, каб стварыць падобныя цэнтры, запатрабуюцца матэрыяльныя і маральныя затраты, але ўсё гэта акупліваецца.

Думка аб стварэнні цэнтраў агульнаадукацыйнага, прафесійнага і ў цэлым сацыяльнага развіцця савецкай рабочай моладзі ўжо некалькі гадоў ажыццяўляецца таксама мінскімі педагогамі. Адной з першых, хто выказаў такую пазіцыю, была цяперашні дырэктар школы працуючай моладзі № 5 Валянціна Браташ.

Аднак спачатку ідэя не знайшла належнай падтрымкі. Справа новая, і, «прабіваць» яе было вельмі няпроста. Вось і давялося Валянціне Іосіфаўне і яе калегам па школе на свой страх і рызыку пачаць стварэнне самага першага, магчыма яшчэ недасканалага, але патрэбнага маладым людзям цэнтра навучання і выхавання, спачатку на базе самой школы. Што ж зроблена імі? Цяпер тут рабочы можа атрымаць не толькі агульнаадукацыйныя веды, а і дастаткова дакладна арганізавана прафесійнае навучанне з дапамогай лекцый спецыялістаў з вытворчасці, кансультацыі па вытворча-тэхналагічных пытаннях. Тых, хто жадае вучыцца далей, запрашаюць на падрыхтоўчыя курсы. Аўтааматарам прапаноўваюць курсы ваджэння, тут жа праходзяць заняткі курсаў кройкі, шыцця, вязання, ну, а для тых, хто любіць сад і агарод — свае курсы. Пачынанне вельмі спадабалася рабочай моладзі. Цяпер такія цэнтры актыўна працуюць у горадзе Ветцы Гомельскай вобласці, у Калузе, Рызе, ды і ў Мінску іх ужо не адзін. І патэнцыял цэнтраў далёка не вычарпаны. Тут ёсць магчымасць праводзіць сустрэчы з цікавымі людзьмі, выстаўкі народнай творчасці, экспазіцыі па тэхніцы, садаводству, архітэктуры, мастацтву і многае іншае.

**У мінулым годзе 56 працэнтаў усіх вячэрніх школ БССР мелі дастаткова трывалую матэрыяльна-тэхнічную, кадравую базу для ўсебаковай сацыяпрафесійнай падрыхтоўкі сваіх слухачоў. 32 працэнты знаходзяцца ў стадыі рэканструкцыі, перабудовы навучальна-выхаваўчай работы.**

Пацікавіўся я меркаваннем аб рабоце падобных адукацыйных цэнтраў і ў тых, для каго яны адкрыты — маладых рабочых мінскіх заводаў шасцерань, трактарнага і аўтамабільнага. У асноўным ідэя ўсім здаецца карыснай і цікавай. Але былі і пажаданні, нават апасенні. У прыватнасці, некаторыя з маіх субяседнікаў непакоіліся, каб такія цэнтры не перайшлі на платныя паслугі: гэта было б адчувальна для даволі сціплага бюджэту маладых людзей.

І ўсё-такі, чым жа адрозніваюцца падобныя адукацыйныя цэнтры ад звычайных вячэрніх і дзённых школ, сістэмы прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў?

Адказ далі самі навучэнцы.

**Анжэла КАРАНЕВІЧ:** Наш цэнтр не такі, як іншыя вячэрнія школы. Спецыфіка яго ў тым, што мы тут вучымся яшчэ і таму, што спатрэбіцца нам у жыцці кожны дзень, у быце. Напрыклад, вывучаем элементы кройкі і шыцця і хутка ўжо будзем наладжваць невялікія конкурсы выкананага намі моднага адзення. Для гэтага з намі ўжо пачалі працаваць вопытныя швачкі-майстры. А вячэрняя школа гэтага не дасць.

**Дзмітрый МЯШЧАНІН:** Цэнтр прыцягвае добра пастаўленай інфармацыяй. Гэта дазваляе гаварыць пра многае не па чутках, а абапіраючыся на факты. Спецыяльна створаны клуб «Дыскусія». Сюды прыходзяць не толькі вучні, але іх бацькі, сваякі, дзеці.

**Валерый ЧАЛЕВІЧ:** А для мяне асабліва цікавая служба падрыхтоўкі вадзіцеляў аўтатранспарту. Пасля ўрокаў мы вырашылі самастойна выраблягь некаторыя запасныя часткі да аўтамабіляў. У хуткім часе думаем паспрабаваць свае сілы ў самастойнай зборцы першага рэканструяванага аўтамабіля.

**Паводле даных статыстыкі, у мінулым годзе ў народнай гаспадарцы Беларускай ССР працавалі 64 працэнты рабочых, якія не маюць закончанай сярэдняй адукацыі. З іх маладыя рабочыя складалі больш за 20 працэнтаў. Навучаннем у вячэрніх школах ахоплена амаль 85 працэнтаў усёй рабочай моладзі рэспублікі, якая не мае сярэдняй адукацыі.**

Ну, а цяпер некалькі слоў пра мастацтва. Чаму? Таму што сёлета тут плануецца ўласнымі сіламі стварыць самадзейны тэатр. Пакуль рэпетыцыі драмгуртка праходзяць у Палацах культуры МАЗа, МТЗ і іншых буйных прадпрыемстваў. Трэба паспрабаваць свае сілы, дасягнуць жадаемага. Вось такія задачы і перспектывы ў цэнтра працуючай моладзі пры адной з вячэрніх школ Мінска. За справу ўзяліся творча, і гэта прыносіць поспех.

**Сяргей АНУПРЫЕНКА.**

## КТО ЖЕ ЗА ПЕРЕСТРОЙКУ?

# СОЦИАЛИСТИЧЕСКИЙ КОНСЕРВАТИЗМ

Перестройка в СССР идет трудно. Сопротивляются ей десятилетиями складывавшиеся структуры, инерция устоявшихся форм и приемов работы. На уровне сознания и психологии сопротивление представлено набором суждений и убеждений, объединяемых в понятие «консерватизм».

Житейское представление о консерватизме связывает его просто с приверженностью старине, с неприятием перемен. В политике консерватизм обнаруживает свое куда более сложное содержание. Как хорошо известно из политической жизни Запада, быть консерватором еще не значит противиться всяким переменам. Консерватизм, связанный с именами Р. Рейгана в США и М. Тэтчер в Англии, наглядно показал и свою волю, и способность ломать традиции, изменять общественные «правила игры».

Высшая ценность, которую защищает и пропагандирует западный консерватизм,— это ничем не ограниченная свобода личности, логически предполагающая, что на человеке лежит вся полнота ответственности за его собственное благополучие. Соответственно, отрицается и целесообразность общественной и государственной заботы об удовлетворении жизненных потребностей индивидуума — будь то крыша над головой или работа, обеспечивающая средства к существованию.

У консерватизма, стоящего на пути советской перестройки, лицо иное. Консервативное сознание покоится на идее о всесторонней ответственности общества за судьбу человека, на доказанных преимуществах, которые имеет в этом смысле социализм.

Если бы «советский тори» оказался минувшей весной среди полноправных членов английского парламента, он, не колеблясь, присоединился бы к противникам правительственного законопроекта о финансировании местных органов власти. Он бы убежденно голосовал против заложенной в законопроект идеи, что государство предоставляет гражданам только равенство возможностей и ничуть не отвечает за то, чем это оборачивается на деле для каждого из них, за то, в данном случае, что одинокий миллионер будет платить в муниципальную казну вдвое меньше, чем супружеская пара, живущая на пенсию. Но и ревностный сторонник перестройки, случись ему объявиться в той же роли английского парламентария, также не принял бы подобного вопиющего безразличия к социальным последствиям законотворчества, продиктованного бюджетными интересами государства.

Где же расходятся консервативные взгляды с идеологией перестройки? В исходной точке, то есть в представлении о взаимоотношениях между личностью и обществом. Начатое в СССР обновление социализма опирается на философскую посылку, суть которой в признании одновременно и общественной ответственности за человека, и личной ответственности индивидуума за состояние дел своих и всенародных. Отвергается однобокость, ведущая либо к вознесению одного над всеми, либо к подавлению всеми одного.

Невооруженному глазу советский консерватизм обычно открывается в осуждениях тех или иных новшеств в нашей экономической, политической, духовной жизни. Взять, к примеру, только три из бесконечного ряда тем, вызывающих консерваторов на спор с перестройкой.

Из прошлого — Сталин. Отнюдь не одиночки требуют сохранить ореол его славы и величия, вновь и вновь упирая на то, что с именем диктатора неразрывно связаны выдающиеся экономические и социальные завоевания социализма, победа в жесточайшей войне.

Из настоящего — кооперативы. Вопреки букве и духу недавно принятого Закона о кооперации, множество людей не готово примириться с производством, предоставлением услуг, торговлей за пределами государственного сектора.

Из будущего — цены. Велик хор голосов, настаивающих, что надвигающаяся реформа цен и ценообразования неминуемо приведет к удорожанию жизни и уничтожит одно из замечательных достоинств социализма, обеспечившего положение, при котором основные товары и социальные блага всем доступны, всем по карману. Напоминанием, что «при Сталине цены снижались», замыкается круг обычных рассуждений, представляющих консервативный образ мысли.

Поклонники Сталина, ненавистники кооперации либо противники новых цен толкуют в конце концов лишь о частностях. Но за этими их откликами на злобу дня стоит определенная система убеждений мировоззренческого порядка.

Очень часто консерватизм в советском обществе связывают с засильем бюрократии. Отсюда выводится и количественная характеристика социальной базы, на которую он опирается — 18 миллионов человек (число занятых в аппарате управления). Но статистика не упоминает, что в число 18 миллионов входят Генеральный секретарь ЦК КПСС и множество других лидеров перестройки в высшем, среднем и низшем эшелонах руководства. Так что цифра явно завышена.

Однако она серьезно занижена — в том смысле, что ограничивает «подсчет консерваторов» средой управленцев. Советский экономист и публицист Геннадий Лисичкин указал на существование своего рода стихийного союза некомпетентных управленцев с некомпетентными же людьми, занятыми непосредственно производственным трудом. Вероятно, несостоятельные работники, независимо от рода их деятельности, действительно сплочены некоторой общностью интересов, предрасполагающих к умонастроениям консервативного толка.

Но опять-таки брать надо значительно шире, причем с учетом шкалы ценностей, за которую держится консерватизм. Ведь он настаивает, чтобы в обмен на заботу государства-опекуна люди неукоснительно следовали поистине пуританским идеалам строгой дисциплины, воздержанности в запросах, самоотверженности в труде. Никто, надо думать, не согласится, что эти идеалы могут объединять людей обленившихся, духовно пустых. Бюрократы и разгильдяи способны разве что расчетливо притулиться к такой идеологии, но принадлежит она не им. Кому тогда?

Машинист поезда метро через телеэкран доводит до сведения общественности свое возмущение доходами объединившихся в кооператив швейников. «Как бы много они ни работали, их труд не сравнить с моим—ни по ответственности, ни по напряженности. Но зарплата моя гроши по сравнению с тем, что получают эти закройщики и портнихи. Это что — оплата по труду?!» Вот кончик Ариадниной нити, ведущей к источнику, обильно питающему наш консерватизм, — к долго-долго длящемуся разрыву между результатами труда и мерой его вознаграждения. Социальный оплот консерватизма составляют люди, сознающие или инстинктивно чувствующие, что их труд либо недоплачивается, либо переплачивается.

Но почему реформы, меняющие лицо нашей экономики социальной жизни, не устраивают честных тружеников, подобных упомянутому машинисту московского метро? Им-то что грозит? Ничего. Наоборот, открываются возможности повышения заработка. Однако непросто рабочему человеку понять и обрести уверенность, что дело идет именно к установлению его зарплаты на уровне, отвечающем результатам, ответственности и напряженности его труда. Целые поколения выросли у нас в условиях почти неподвижных тарифов и окладов: сколько ни работай, как ни трудись, при своей ставке останешься. Массовая психология хорошо усваивает жизненные уроки, а нынешние перемены когда-то еще принесут новый опыт, который вызовет в ней серьезные сдвиги. Пока же летящие в гору доходы кооператоров режут душу обидой, заливают тоской по старым добрым временам, когда ни на деле, ни теоретически не допускалось, чтобы «частник» мог не то что вырваться вперед, а хотя бы сравняться с уважаемым тружеником государственного предприятия.

Нестойкое, подвижное, но ощутимо дающее о себе знать размежевание советского общества на «реформаторов» и «консерваторов» проходит по линии, пролегающей между готовыми и неготовыми разделить с государством ответственность за свое собственное благополучие, за свой душевный покой. Эта линия не совпадает с границами социальных или профессиональных групп. Она рассекает население по вертикали. Сплошь и рядом она проходит по «живому телу» индивидуума.

Вопрос, стало быть, не в том, сколько у нас носителей консерватизма сегодня — имя им даже не легион, а много больше. Проблема в том, сколько их будет завтра. Это в решающей степени зависит от хода экономических преобразований и всех сопутствующих им социальных, политических перемен. Последовательное соблюдение принципа «по труду» вырвет основной корень консервативных тенденций. До этого еще далеко. Лишь широко раздвинутая самостоятельность предприятий, подряд и аренда на селе, возрождение кооперации могут выбить почву из-под ног консерватизма, обратить многих вчерашних его приверженцев в веру перестройки.

Последнее особенно важно. Политика перестройки не может быть политикой расправы с консерваторами, исключения их из общественной жизни. Несмотря на всю остроту то и дело возникающих конфликтов с «антиперестроечными силами», генеральная задача состоит не в их «уничтожении», а в привлечении на сторону реформ. Лучшего пути, чем спорить и договариваться, не существует. И путь этот открыт, поскольку «социалистический консерватизм» ни в коем случае не враг социализма.

**Василий ДЕМИДОВ.**

## «МОНОЛИТНОСТИ МНЕНИЙ» В СССР НИКОГДА НЕ БЫЛО

# НАРОД ОБРЕТАЕТ ГОЛОС

Взгляды на общественное мнение в СССР разделились. Одни считают, что за три с половиной года перестройки оно настолько повзрослело, что становится реальной политической силой. Другие полагают, что оно делает лишь первые самостоятельные шаги. Но в любом случае в отношении общественного мнения достигнут четкий и никем уже не оспариваемый «консенсус»: оно необходимо, его отсутствие явилось причиной серьезных политических и экономических просчетов.

В частности, свертывание в СССР некогда широко развитого кооперативного движения и разгром в период насильственной коллективизации частного сектора в деревне, приведшие к стагнации сельскохозяйственного производства, а в более долгой перспективе и к «раскрестьяниванию» страны, является следствием того, что сторонники альтернативных путей в сельском хозяйстве, такие, например, как Н. Бухарин и А. Чаянов, не могли опереться на общественное мнение, оказались беззащитными и были уничтожены.

«Монолитности мнений» в таком большом и сложном обществе, как советское, никогда не было и быть не могло. Миф о «полном единодушии» был необходим Сталину, чтобы вначале лишить голоса своих политических оппонентов, а потом скрывать и подавлять общественное недовольство, которое не могло не проявиться перед лицом очевидных провалов сталинских планов насильственного «осчастливливания» народа.

Датой окончательной смерти общественного мнения в СССР следует, вероятно, признать 1937 год, когда не понравившиеся Сталину результаты переписи населения, отразившие пагубные итоги насильственной коллективизации, были объявлены недействительными, а многие организаторы переписи осуждены и расстреляны. В 1939 году была проведена новая перепись, фальсифицированные результаты которой уже полностью отвечали сталинской модели построения социализма. С тех пор и общественное мнение, и социологические исследования, и статистика в СССР были, по сути, лишь имитацией голоса народа, питающей мифологию сталинского режима. «Общественное мнение» спускалось массам сверху через систему идеологических органов и затем поднималось вверх в виде ликующих писем «трудящихся». Так продолжалось без малого 60 лет.

Перестройка вернула народу голос. Гласность разбудила общественное мнение, на счету которого уже имеются первые серьезные победы. Оно предотвратило реализацию уже готового «проекта века»—поворот северных рек к югу,—грозившего непредвиденными экологическими последствиями. Общественное мнение оказалось важным фактором и когда в обществе разгорелся принципиальный для перестройки спор о «наследии Сталина», и о наследниках его «принципов». Общественность неоднозначно высказалась за преодоление сталинизма и в политике, и в экономике, и в идеологии, и в морали.

За три с половиной года гласности общественное мнение достаточно окрепло, чтобы суметь защитить свое право на свободную подписку на газеты и журналы, которую в 1988 году пытались существенно ограничить. Подтвержденное Советом Министров СССР право на свободную подписку является крупной победой общественного мнения.

Все решительнее общественное мнение вторгается в область идеологии.

В течение нескольких лет, а фактически с начала перестройки, общественность боролась за отмену постановления 1946 года «О журналах «Звезда» и «Ленинград», бывшего в течение сорока лет орудием насилия над литературой и искусством со стороны идеологических ортодоксов. В последние годы это постановление де-факто уже не действовало. А имена писателя Михаила Зощенко и поэтессы Анны Ахматовой, против которых в постановлении содержались вульгарные окрики, уже давно возвращены в историю советской культуры. Общественное мнение победило.

В октябре прошлого года Политбюро ЦК КПСС аннулировало постановление «О журналах «Звезда» и «Ленинград» как ошибочное. В решении подчеркивается, что «в условиях революционной перестройки политика в области литературы и искусства практически дезавуировала и преодолела эти положения и выводы, доброе имя видных писателей восстановлено, а их произведения возвращены советскому народу».

В настоящее время советская общественность пытается «уточнить» и истинную ценность наследия Михаила Суслова, считавшегося еще четыре-пять лет назад непререкаемым идеологическим авторитетом в СССР. Несколько недель назад студенты Московского государственного университета потребовали снять мемориальную доску Суслова со здания факультета журналистики МГУ. Деканат факультета и партком университета поддержали студентов.

Все понимают, что вопрос о мраморной доске в память Суслова менее всего относится к сфере декоративного искусства, а касается сути идеологического обновления страны. Ведь в глазах интеллигенции Суслов является таким же символом идеологического застоя, каким в эпоху сталинизма являлся Жданов.

Для того чтобы покончить со «ждановщиной», общественному мнению, разбуженному перестройкой, потребовалось три с половиной года. Сколько потребуется, чтобы перешагнуть через другие монументы застоя?

В быстро эволюционирующей политической и нравственной обстановке в стране ответить на это безошибочно трудно. Но ясно одно: время в СССР течет сегодня значительно быстрее, чем четыре года назад, и общественное мнение является его мощным ускорителем.

**Вячеслав КОСТИКОВ.**

**Страница подготовлена по материалам АПН.**

*ЗНАЁМІМ З ТВОРЧАСЦЮ МАЛАДЫХ*

# ГЛЕДАЧА ВЫБІРАЮ Ў СААЎТАРЫ

Старт быў прыгожым, можна нават сказаць — бліскучым. І вы зараз зразумееце, чаму. За дыпломную работу — роспіс адной са сталічных школ выпускнік Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Уладзімір Качан стаў лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі, быў прыняты ў Саюз мастакоў БССР і, акрамя таго, рэкамендаваны да ўдзелу ў конкурсе на медаль Акадэміі мастацтваў СССР. З ім імкнуліся сустрэцца журналісты, каб расказаць чытачам, што за чалавек малады мастак, які яго творчы патэнцыял. А Уладзімір Качан неўзабаве пасля атрымання дыплома знік з горада. Але ж у школу, распісаную ім, уваход быў нікому не забаронены. І я пайшла паглядзець роспіс. Убачыла — і ахнула: на перакрыжаванні лесвічных маршаў, якія аб'ядноўваюць дзве паловы будынка, перад вачыма ўзніклі карціны, дзе ажылі рэальныя фігуры і казачныя персанажы. На адной: узараны пласт зямлі, аплецены магутнымі карэннямі сімвалічнага дрэва нацыянальнай культуры, і побач жанчына ў намітцы, што трымае ў руках саламяную птушку. На другой: юнак на кані, а за яго спіной — ці то крылы, ці то ветразі. У руках коннік трымае кнігу — знак адукаванасці і класічных ведаў. Побач з дзяўчынай, якая, відаць, у марах уявіла сябе казачнай прынцэсай, а таму апранута ў раскошны бальны ўбор, — сучасны падлетак з навушнікамі і фантастычным інструментам у руках. Ён цалкам захоплены музыкай...

Я доўга хадзіла тут, разглядаючы кожную кампазіцыю, падымалася па лесвіцах, нібы ўдзельнічала ў нейкай дзіўнай гульні, прапанаванай гледачам мастаком.

З Уладзімірам Качаном я так і не сустрэлася ў Мінску. Давялося ехаць у Гродна, адкуль ён родам і дзе жывуць яго бацькі. Зусім нядаўна Уладзімір атрымаў тут творчую майстэрню. Літаральна пад вокнамі — аўтавакзал. Вельмі зручна: у любы момант можна рушыць у дарогу, хочаш — у Мінск, хочаш — у Брэст. Так ён і робіць, калі ўзнікае патрэба «перамяніць дэкарацыі». Але гэта майстэрня, што знаходзіцца ля вялікага шляху, — надзейны прытулак ад гарадской мітусні і месца, дзе можна быць сам-насам з сабой і з усім светам.

Малады мастак аказаўся чалавекам надзвычай гаваркім.

— Нават не ведаю, ад каго з продкаў у мяне гэта схільнасць да філасофствавання і самааналізу, — казаў, зручна ўладкаваўшыся ў крэсле, гаспадар майстэрні, з любоўю і густам аформленай уласнымі рукамі.— Варта пакапацца ў сваім радаводзе. Ад бацькі ў мяне (а ён рабочы) уменне абстрагавацца. Маці сваю я абагаўляю, яна ад прыроды адорана многім. Брат стаў журналістам, працуе ў абласной газеце. Ну а мой бог і рэлігія — мастацтва.

Чытачу можа здацца, што маладога мастака песціць лёс, можа падацца, што ён занадта ўпэўнены ў сабе, нават трохі самаўлюбёны. У мяне таксама ўзнікла спярша такое ўражанне. Але яно хутка развеялася. Не збіраюся абцяжарваць вас фактамі біяграфіі 30-гадовага чалавека, хаця некаторыя з іх я лічу значнымі для разумення яго характару і ўчынкаў, маштабу асобы. Скончыўшы школу, юнак едзе ў Ленінград, каб паступіць у мастацкае вучылішча. Месяц займаецца там на падрыхтоўчых курсах, дзе малюнак і кампазіцыю выкладаюць славутыя майстры, ходзіць па музеях, глядзіць шэдэўры сусветнага мастацтва. І гэтак тры гады запар. Кожнага разу, вярнуўшыся ні з чым дамоў, Уладзімір не кідаецца ў паніку. Тым больш, што пасада мастака-афарміцеля на адным з прадпрыемстваў Гродна дазваляе не разлучацца з пэндзлем і фарбамі.

А потым воінская служба, пасля чаго Качан становіцца студэнтам Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. На апошнім курсе, перад самым выпускам, бярэцца распісаць школу.

— Мяне адгаворвалі знаёмыя, сябры,— прызнаецца мой субяседнік, — казалі, што гэта авантурная задума — выканаць такі роспіс за няпоўныя два месяцы. Яны мелі рацыю. Сапраўды была рызыка. І я мог пацярпець поўны крах. Або прынцыпова змяніць уяўленне пра характар, узровень і магчымасці выпускнікоў і нават — пра жыццядзейнасць інстытуцкай сістэмы ў практычных умовах. Мяне падтрымаў выкладчык і кіраўнік дыплома Гаўрыла Вашчанка, ухваліў тэму. А яна была сфармулявана так: «Дыялектыка пазнання і фантазія. Праз пазнанне — да фантазіі. Праз фантазію — да пазнання». Фантазіраванне, гульня ўяўлення — вельмі характэрная рыса дзіцячага мыслення. Тыя веды, што мы атрымліваем на ўроках, іншым разам вядуць у свет фантазіі, гіпотэз і ўяўленняў. А гэта верны спосаб знаёмства з навакольным светам.

— Ці ўзнікалі сумненні ў час працы?— спрабую я больш даведацца пра тое, як выконваўся роспіс.

— Так,— ківае галавой у знак згоды Уладзімір. — І тады я прапанаваў самім школьнікам прыняць удзел у гульні ўяўлення, нібы запрашаючы іх да творчасці. І першакласнікі, і дзесяцікласнікі сталі сааўтарамі моёй работы. Дапамогу аказалі і вучні, і настаўнікі. Яны з цікавасцю ўспрынялі ўмовы прапанаванай мною гульні і сваімі заўвагамі дапамаглі знайсці больш дакладнае пластычнае рашэнне той ці іншай дэталі роспісу. А для дзяцей гэта быў першы, такі блізкі кантакт з мастацтвам.

Дазволю сабе трохі дапоўніць расказ мастака пра работу над даволі складаным не толькі для студэнта, але і для вопытнага майстра роспісам. Ён працаваў тады ўвесь дзень, іншым разам не спускаючыся з рыштаванняў дацямна. Усё да апошняга мазка выканаў сам. Калі напярэдадні школьнага выпускнога вечара знялі рыштаванні, аўтар перажываў найвялікшае ўзрушэнне: перад ім паўсталі героі яго алегарычных карцін, якія пачыналі ўжо жыць самастойна, не падуладныя волі свайго стваральніка.

Пазней пра выкананы У. Качаном роспіс спецыялісты скажуць: «Зроблена спроба асэнсаваць духоўную спадчыну народа, убачыць яго сённяшні дзень скрозь прызму часу, векавой мары пра шчасце. Цэнтральнай думкай усёй гэтай кампазіцыі, яе сэнсавым стрыжнем з'яўляецца думка аўтара пра свайго сучасніка».

Неўзабаве пасля бліскучай абароны дыплома аб вышэйшай мастацкай адукацыі Уладзімір паехаў у Гродна. Як ён кажа, ехаў з пачуццём упэўненасці ў сабе, з разуменнем таго, што нешта ўжо можа.

Такім чынам, першая дзея, у якой нашаму герою спадарожнічае поспех, заканчваецца. І пачынаецца другая, дзе маладому мастаку даводзіцца, як кажуць, усё пачынаць з нуля, сутыкнуўшыся з мноствам творчых, арганізацыйных і бытавых праблем.

— Шкада, што на іх вырашэнне трацiцца іншы раз так многа каштоўнага часу, — не стрымліваецца Уладзімір, пачаўшы даказваць мне неразумнасць тых парадкаў, пры якіх праблемай становіцца атрыманне майстэрні для работы, творчых заказаў, а таксама і шырокі выхад на гледача.

— Асабіста мне, можна сказаць, пашчасціла, — лічыць У. Качан.— Я пачынаю сваю творчую біяграфію, калі ва ўсіх сферах на-

*НА СТАЛІЧНАЙ СЦЭНЕ — ЛЕПШЫЯ СПЕКТАКЛІ КРАІНЫ*

# ТЭАТР ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

**У леташнім тэатральным сезоне ў Маскве быў створаны новы, унікальны ў сваім родзе творчы арганізм — Дзяржаўны тэатр Дружбы народаў, асноўная мэта якога — паказ на сталічнай сцэне лепшых спектакляў з усёй краіны. Узначаліў тэатр народны артыст СССР, прафесар Яўгеній Сіманаў.**

**У дні, калі тэатр Дружбы народаў адкрываў свой другі сезон, карэспандэнт Агенцтва друку Навіны сустрэўся з Яўгеніем СІМАНАВЫМ і ўзяў у яго інтэрв'ю.**

*— Як вы ацэньваеце сам факт з'яўлення такога тэатра?*

— Я б назваў гэты тэатр дзецішчам перабудовы. Менавіта сёння, калі пытанні міжнацыянальных адносін стаяць у краіне так востра і актуальна, асабліва неабходны шырокі абмен культурнымі каштоўнасцямі паміж рэспублікамі.

Акрамя таго, важна наступнае: людзі заўсёды былі рознымі, тым больш належачы да розных нацыянальных культур. Мы занадта рана вырашылі, што аднадумства, ды яшчэ дэкрэтаванае зверху, і ёсць наша агульнасацыяльная сутнасць. Так, мы ўсе належым да адзінай сацыялістычнай культуры, але ў той жа час размова ідзе пра сукупнасць духоўных каштоўнасцей усіх нацый і народнасцей, якія жывуць у нашай вялікай краіне, пра асаблівасці кожнай нацыянальнай культуры, пра ўзаемнае знаёмства з гэтымі культурамі. Не ведаць духоўных каштоўнасцей рускай, украінскай, беларускай, грузінскай, армянскай, азербайджанскай ды і ўсіх іншых народаў краіны — гэта свядома абядняць сябе. Мне здаецца, што нельга лічыць сябе культурным чалавекам і не ведаць пры гэтым паэзіі Яна Райніса, Лесі Украінкі, Нізамі, Аванеса Туманяна, Шырванзадэ... Але, на жаль, сёння маладыя людзі, якія канчаюць сярэднюю школу, не маюць ніякага ўяўлення нават аб выдатных прадстаўніках многанацыянальнай літаратуры, такіх, напрыклад, як Янка Купала, Шата Руставелі, Саламея Нерыс, Габдула Тукай. У школах гэтаму, на жаль, не вучаць...

Вось наш тэатр і закліканы, у прыватнасці, запаўняць гэтыя прабелы ў культурным выхаванні многіх нашых сучаснікаў. Да таго ж паказ спектакляў на сталічнай сцэне паслужыць дадатковай рэкламай для тэатраў краіны.

У цэлым жа, на мой погляд, стварэнне тэатра Дружбы народаў — падзея першаступеннай важнасці ў творчым жыцці не толькі савецкай сталіцы, але і ўсёй краіны.

*— Што паказаў леташні сезон у вашым тэатры?*

— За гэты час мы змаглі пазнаёміць сталічных гледачоў і гасцей Масквы з вельмі цікавымі работамі з розных савецкіх рэспублік. Асабліва парадавалі ўсіх Рыжскі тэатр юнага гледача, які паказаў п'есу Барыса Васільева «Заўтра была вайна» ў пастаноўцы Адольфа Шапіры, і Тбіліскі тэатр кінаакцёра, які прывёз спектакль па п'есе сучаснага амерыканскага аўтара Тома Уайдлера «Наш гарадок» у пастаноўцы Міхаіла Туманішвілі. Хацелася б таксама адзначыць работу армянскага рэжысёра Армена Хандзікяна «Аўтобус», эстонскага рэжысёра Міка Міківера «Пярэвараценъ»... І, вядома, нельга не сказаць, што проста ашаламляючае ўражанне на гледачоў зрабіў акцёр Хасыў Гадоеў, які сыграў галоўную ролю ў спектаклі Таджыкскага тэатра драмы «Цар Эдып» Сафокла.

Так што, мінулы сезон можна назваць дастаткова плённым. І калі б не адміністрацыйна-арганізацыйныя цяжкасці, то, я ўпэўнены, нам удалося б зрабіць яшчэ больш.

*— Гаворачы аб цяжкасцях, вы маеце на ўвазе адсутнасць у вас пастаяннага будынка?*

— Так, у першую чаргу. Не маючы ўласнага будынка, уласнай сцэны і рэпетыцыйных памяшканняў, мы можам запрашаць у Маскву толькі апрабіраваныя спектаклі для паказу на «чужых» тэатральных пляцоўках. А пры такой практыцы ўзнікае рэальная небяспека ператварэння тэатра Дружбы народаў у пракатную кантору...

Я перакананы, што тэатр Дружбы народаў павінен мець і ўласную трупу, і свае пастаноўкі. Напрыклад, вельмі цікавымі могуць быць спектаклі, звязаныя з сумеснай работай вядучых рэжысёраў з розных савецкіх саюзных рэспублік і нават розных краін. У нас ёсць і канкрэтныя прапановы падобнага тыпу. Вось адна з іх: сумесная савецка-амерыканская пастаноўка спектакля «Лісістрата» па Арыстафану. Мне думаецца, што работа вядучых замежных рэжысёраў з савецкімі акцёрамі магла б даць вельмі цікавыя вынікі.

А што тычыцца акцёраў, якія ігралі б у спектаклях тэатра Дружбы народаў, то я ўпэўнены, што змог бы сабраць вельмі моцную трупу з цудоўных артыстаў, якія альбо не маюць дастатковай загружанасці работай у сваіх тэатрах, альбо толькі здымаюцца ў кіно.

Але пакуль усё гэта толькі ў праекце...

**Інтэрв'ю ўзяла Наталля ПІВАВАРАВА.**

# ПА НЁМАНУ ПЕСНЯ ПЛЫВЕ

Даўняя дружба ў беларусаў з суседнім літоўскім народам.

«Мы рады, што нас яднаюць і прыгажун Нёман, і наша творчая праца, і тыя трывалыя масты братэрства, якія мы будавалі і будуем сваім сэрцам і розумам, глыбока ўсведамляючы гістарычную перспектыву і вялікі сэнс савецкага інтэрнацыяналізму», — піша вядомы літоўскі пісьменнік Эўгеніюс Матузявічус.

Народны паэт Беларусі Максім Танк зазначае:

«На берагах Нёмана-Нямунаса, Віліі-Нярыс шумяць тыя ж самыя сосны і нівы, гняздуюцца і спяваюць адны і тыя ж птахі, падобныя ўзоры на ручніках, адны і тыя нягоды і радасці гучаць у народных думах, абрадавых песнях, бо аднолькавыя гістарычныя повязі лучаць нашы народы. Відаць, цяжка знайсці больш мірных суседзяў, якія за ўсё сваё доўгае жыццё ніколі не канфліктавалі».

Многія старонкі жыцця і творчасці песняра Беларусі Якуба Коласа звязаны з сённяшняй сталіцай Літвы, якая з'яўлялася супольным культурным цэнтрам. «Якуб Колас увайшоў у беларускую літаратуру пад літоўскім небам»,— пісаў Костас Корсакас. У Вільні, у газеце «Наша доля», 1 верасня 1906 года быў надрукаваны першы верш паэта «Наш родны край». Тут пабачылі свет яго кнігі «Песні-жальбы» (1910), «Апавяданні» (1912), «Родныя з'явы» (1914). Пачынаючы з 1906 года, беларускі пясняр неаднаразова прыязджаў у Вільню, працаваў тут у рэдакцыі «Нашай Нівы»,

Пра сувязь народнага паэта Беларусі Якуба Коласа з братняй Літвой расказвае выстаўка «Па Нёману песня плыве», што нядаўна адкрыта ў горадзе Каўнасе.

**К. СЦЕПАНЮК.**

шага жыцця нешта мяняецца.

Гэта адчуваецца не толькі ў сталіцы, але і ў нас. Арганізуюцца выстаўкі, у якіх удзельнічаюць мастакі самых розных творчых напрамкаў. Вялікія змены адбыліся ў дзейнасці Саюза мастакоў БССР, Мастацкага фонду. Расстаўляюцца акцэнты ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавай і мастаком. Зжывае сябе старая сістэма заказаў, пры якой тысячы нікому непатрэбных твораў аселі ў запасніках. Але ж мастацтва, я думаю, не можа існаваць без мецэната. Проста мецэнат у асобе дзяржавы павінен субсідзіраваць тое, што патрэбна людзям, што выхоўвае ў іх эстэтычнае пачуццё, духоўнасць. Вельмі станоўчая з'ява — менеджэры ў сферы выяўленчага мастацтва. Яны, з'яўляючыся пасрэднікамі паміж мецэнатам і мастаком, забяспечваюць яго работай, ажыццяўляюць куплю-продаж твораў.

За дзве-тры гадзіны нязмушанай гутаркі мы паспелі так ці інакш закрануць ледзь ці не ўсе самыя галоўныя праблемы нашага сённяшняга жыцця. Вялі гаворку пра стан нацыянальнай культуры і шляхі яе развіцця, пра суперкультуры свету і прызначэнне мастацтва, пра яго асабісты ўдзел у перабудове і дэмакратызацыі грамадства.

— У нас у Гродне ёсць клуб «Паходня», які аб'ядноўвае творчую і тэхнічную інтэлігенцыю, рабочых, служачых. Яны канкрэтнымі справамі ўносяць свой уклад у перабудову. Напрыклад, удзельнічаюць у рэстаўрацыі помнікаў мінулага, у арганізацыі святаў і гэтак далей. Ведаеце, мне іншы раз так хочацца далучыцца да іх,—уздыхае Уладзімір. — Але падсвядома адчуваю, што мой фронт — вось тут, ля няскончанай карціны. Звычайна працую па 15—16 гадзін. Менавіта мастацтва павінна асэнсаваць наш час ва ўсіх яго супярэчнасцях, адлюстраваць свет і чалавека ў ім, прымусіць кожнага думаць аб вечных і ілюзорных каштоўнасцях, аб сэнсе нашага жыцця і лёсе чалавечай цывілізацыі. Я тут заканчваю адну работу... Яна навеяна якраз гэтымі думкамі.

Так я стала амаль што першым гледачом жывапіснай карціны, якая разам з іншымі творамі гродзенскіх мастакоў будзе прадстаўлена на выстаўцы, што мяркуецца неўзабаве адкрыць за мяжой у сяброў-беларусаў з Беластока. Назва інтрыгуючая: «Бачанне стоўпніка Уладзіміра». Стоўпніка?— імкнуся я ў слове адшукаць сэнс. У хрысціянстве, як вядома, гэта рэальная або міфічная асоба, якая выконвала рэлігійны зарок нерухомага стаяння на калонах ці слупах.

Пры чым тут стоўпнік у канцы XX стагоддзя?

...Маленькая фігурка старога ў цэнтры палатна. А вакол яго бясконцы космас, жывая клетка, матэрыя, рэчыва. Зышліся мікра- і макрасусвет. І ёсць у гэтым, ужо бачыцца мне, свая гармонія... Але ж так і падмывае папытацца ў мастака, што задумаў, куды хіліцца яго думка?

Не, маўчыць мастак. І я прыгадваю сказаныя ім раней словы: «Мой глядач павінен стаць маім сааўтарам». Значыць, трэба думаць.

Не хочацца рабіць прагнозаў. Але адно ведаю дакладна: кожны раз, знаходзячыся ў Гродне, я буду імкнуцца зайсці ў гэту майстэрню, а трапляючы на выстаўкі, з нецярпеннем буду шукаць карціны цяпер ужо знаёмага мне аўтара.

**Таццяна АНТОНАВА.**

## ЗДЫМАЕЦЦА КІНО



**Вядомы беларускі кінарэжысёр-казачнік Леанід Нячаеў здымае тэлевізійную двухсерыйную музычную стужку «Не пакідай», прызначаную, як лічыць яе стваральнік, для сямейнага прагляду. Гэта казка пра праўду і яе пошук у жыцці.**

**— Калі ўсе папярэднія мае карціны: «Пра Чырвоную Шапачку», «Рыжы, сумленны, закаханы», «Прыгоды Бураціна», — гаворыць Л. Нячаеў, — ствараліся для дзяцей, то гэтая наша сумесная работа са сцэнарыстам Георгіем Палонскім і аператарам Анастасіяй Сухановай разлічана на дарослых. І хоць, як гаворыцца, дзеянне адбываецца ў нейкай казцы, думаю, што гледачы пазнаюць месца дзеяння. Іх чакае сустрэча з фільмам вострасюжэтным, злабадзённым, хаця і на казачны сюжэт. У новым фільме Леаніда Нячаева заняты многія вядомыя акцёры. Караля іграе Вячаслаў НЯВІННЫ, каралеву — Лідзія ФЕДАСЕЕВА-ШУКШЫНА.**

**НА ЗДЫМКУ: у ролі караля — Вячаслаў НЯВІННЫ.**

**Фота У. ШУБЫ.**

## *Ф. СКАРЫНА І МЕДЫЦЫНА ЯГО ЧАСОЎ*

# ДОКТАР У ЛЕКАРСКІХ НАВУКАХ

З імем доктара медыцыны Ф. Скарыны звязаны пачатак усходнеславянскага кнігадрукавання, якое імкнулася да сапраўднай народнасці і масавасці друкаванага слова. Ф. Скарына спрабаваў выклікаць у чытача цікавасць да вывучэння прыроды, ганарыўся сваёй вучонай ступенню доктара медыцыны і ўпамінаў аб ёй ва ўсіх сваіх прадмовах да кніг. Гэта тым больш важна, што сярод усходніх славян дактароў медыцыны ў XVI—XVII стагоддзях можна пералічыць на пальцах адной рукі.

Мы гаворым тут аб дакладна вядомых дактарах медыцыны, таму што ў дакуменце ад 28 красавіка 1387 года гаворыцца аб прысутнасці «доктара Свягаслава» пры перадачы польскім каралём Уладзіславам Ягайлам свайму брату Скіргайле беларускіх гарадоў Полацка, Мінска і іншых.

Хто быў гэты таямнічы Святаслаў — ці беларус, ці ўрач, з-за таго, што няма адпаведных указанняў у крыніцы, высветліць не маецца магчымасці. Лічыць жа яго ўрачом, як гэта іншы раз робяць, мы пакуль што не маем падстаў.

У Ф. Скарыны быў непасрэдны папярэднік па першадрукаванню сярод усходніх славян і таксама доктар медыцыны— Георгій Катэрмак з Драгобыча, вядомы пад імем Георгія Драгобыча (1450—1494). Ён нарадзіўся ў сям'і рамесніка Міхаіла Даната Катэрмака ў заходнеўкраінскім горадзе Драгобычы.

З 1468 года ён вучыўся на філасофскім факультэце Кракаўскага універсітэта, атрымаў тут званне магістра (1473), выехаў для навучання ў Італію і з 1478 года пасля атрымання ступені доктара філасофіі і медыцыны ў Балонскім універсітэце выкладаў там астраномію, а ў 1481—1482 гадах і медыцыну. Георгій з Драгобыча быў урачом пры двары герцага ў Ферары, а з 1487 года да канца жыцця займаў пасаду экстраардынарнага прафесара медыцынскага факультэта Кракаўскага універсітэта.

З пяці прац Георгія з Драгобыча найбольш вядомая кніга на лацінскай мове «Прагнастычная ацэнка бягучага 1483 года» (Рым, 1483)—першае друкаванае выданне выхадца з усходнеславянскіх зямель. Яе змест мае астранамічны і метэаралагічны характар з ухілам у астраномію і ўпамінаннем масавых заразных захворванняў.

З-за адсутнасці дакументальных даных цяжка сцвярджаць, што Скарына ведаў аб дзейнасці Георгія з Драгобыча. Але сам факт звароту двух першых усходнеславянскіх дактароў медыцыны на працягу чвэрці стагоддзя да кнігадрукавання сімптаматычны. І Георгій з Драгобыча, і Ф. Скарына былі прадстаўнікамі універсітэцкай медыцыны, якая ўвабрала ў сябе традыцыі антычнай, блізкаўсходняй і сярэднеазіяцкай медыцыны. Цяжка сказаць, ці ўмела заходнееўрапейская медыцына, скаваная да XV стагоддзя ланцугамі схаластыкі і містыкі, лячыць хваробы лепш за народную медыцыну. Аднак ва універсітэцкай медыцыны была неаспрэчная перавага. Яна мела больш сталыя пісьмовыя традыцыі, была менш замкнёна ў вузкія нацыянальныя рамкі і з'яўлялася этапам у развіцці міжнароднай медыцыны, у якую, у выніку, уліваліся медыцынскія дасягненні розных краін і народаў.

Гэтая перавага універсітэцкай медыцыны ў Беларусі і Літве выразна праяўлялася ў XVI стагоддзі, калі тут фарміравалася рэнесансная гуманістычная культура, гэтаму садзейнічалі эканамічныя, сацыяльныя і духоўныя змены ў нашых краях.

Пэўную ролю ў развіцці гуманізму ў Вялікім княстве Літоўскім адыгрывалі сувязі з перадавымі краінамі Захаду.

Напомнім, што Вялікае княства Літоўскае знаходзілася першапачаткова ў персанальнай, а затым у палітычнай уніі з Польшчай. «Не дзіўна таму,— пісаў Максім Багдановіч,—што ў эпоху адраджэння агульны інтэлектуальны ўздым, які пачаўся на Захадзе, адбіўся і на Беларусі».

У гэты час асабліва развіваліся тыя галіны ведаў, якія адпавядалі практычным запатрабаванням. У першую чаргу атрымалі развіццё навукі аб прыродзе. Вучоныя-прыродазнаўцы паступова адмаўляліся ад сляпога выканання рэлігійных і дагматычных канонаў, звярталіся да вывучэння жывой прыроды. У ходзе эксперыментаў з'явілася магчымасць рацыянальна тлумачыць навакольны свет.

Ва універсітэтах тады існавалі тры факультэты—багаслоўя, права і медыцыны. Толькі медыцынскі факультэт даваў рэальнае ўяўленне аб навакольнай прыродзе. Цяжка назваць другую прафесію, за выключэннем урачэбнай, якая ў такой ступені падштурхоўвала б чалавека шукаць разгадкі тайны навакольнага свету.

Медыкі вымушаны былі звяртацца да вывучэння ўласцівасцей мінералаў, раслін, жывёл, каб лепш ведаць уласцівасці лякарстваў. Абавязковай умовай павышэння прафесійнага ўзроўню ўрачоў было пастаяннае расшырэнне іх кругагляду і ў галіне медыцыны, і ў сумежных галінах ведаў.

У выніку паступовага распаўсюджання універсітэцкай адукацыі сярод гарадскога насельніцтва з'яўляецца асобая група інтэлігентаў, не звязаных з царквой,—настаўнікаў, юрыстаў, архітэктараў, горадакіраўнікоў. Сярод іх былі і ўрачы. Гэта стварала рэальную падставу для ўзнікнення новай па якасці гуманістычнай культуры.

Росквіт універсітэтаў у Еўропе садзейнічаў дэмакратызацыі і расшырэнню сферы свецкасці адукацыі. Вучоная ступень доктара медыцыны мела вагу амаль што дваранскага тытула і вяла да пэўнага «набыцця высакароднасці» саслоўем гараджан. Недваранскі элемент, людзі нязнатнага паходжання з атрыманнем універсітэцкага дыплома пранікалі ў асяроддзе кіруючых слаёў, занімаючы нярэдка самыя высокія ступені ўрачэбнай прафесіі —прыдворных медыкаў. Такім прыдворным урачом быў і Ф. Скарына.

З 1504 па 1506 год Ф. Скарына вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, у 1512-м атрымаў ступень доктара медыцыны ў вядомым сваімі перадавымі прыродазнаўчанавуковымі поглядамі Падуанскім універсітэце.

Ф. Скарына быў не адзіным выхадцам з Беларусі, які ездзіў за навукай ва універсітэт. Нашы землякі часцей за ўсё вучыліся ва універсітэтах багаслоўю і праву. У матрыкулах, ці метрыках (спісы студэнтаў універсітэтаў), далёка не заўсёды былі звесткі пра выбраны студэнтам факультэт. Можна было наведваць любыя лекцыі на любым факультэце. Імёнаў ураджэнцаў нашага краю, якія абаранялі медыцынскія дысертацыі ў XVI—XVII стагоддзях, нягледзячы на шматгадовыя пошукі, нам выявіць не ўдалося.

Уяўляецца неабгрунтаваным сцвярджэнне, якое сустракаецца ў літаратуры, быццам бы ўжо ў канцы XIV стагоддзя (у 1397 годзе) для абучэння ўрачэбнай справе выхадцаў з Вялікага княства Літоўскага была арганізавана «бурса» (калонія) для «літоўцаў» і «рускіх» у Празе і ў 1409 годзе—у Кракаве. Указанне прафесара Пражскага універсітэта Андрэя з Броды (1360—1427) аб навучанні там «рутэнаў» (гэта значыць, усходніх славян), на якое іншы раз спасылаюцца, не дае падстаў сцвярджаць, што іх вучылі менавіта медыцыне. Чэшскі гісторык В. Халаўпецкі і польская даследчыца Х. Завадзіньска пераканаўча даказалі, што ў адкрытай у 1411 годзе па загаду польскай каралевы Ядвігі «бурсе» (гэты тэрмін нельга перакладаць як «калонія», паколькі гэта быў усяго толькі інтэрнат) ці «літоўскім калегіуме» Пражскага універсітэта не пражываў ні адзін выхадзец з Вялікага княства Літоўскага.

Ці вывучалі там медыцыну ў наступныя стагоддзі, немагчыма ўстанавіць: спісы студэнтаў медыцынскага факультэта універсітэта захаваліся толькі пачынаючы з 1657 года. Гэта выявіў А. Федзінец у архіве Пражскага універсітэта. Звесткі аб навучанні медыцыне ў Кракаўскім універсітэце выхадцаў з Беларусі ў гэты перыяд адсутнічаюць.

Выхадцы з нашага краю звычайна запісваліся ва універсітэты Кёнігсберга (існаваў з 1544 года), Вільні (існаваў з 1578 года), многіх гарадоў Германіі, Аўстрыі, Нідэрландаў, Францыі, Італіі, Швейцарыі.

Мы прагледзелі спісы студэнтаў універсітэта, якія захаваліся і цяпер выдадзены. Іх пералік прыведзены ў кнізе «Падарожжы нашых землякоў» (Мінск, 1968). Толькі за стагоддзе (з сярэдзіны XVI па сярэдзіну XVII стагоддзяў) у гэтых універсітэтах навучалася 466 студэнтаў з магнацкіх сем'яў Беларусі і Літвы. З кожным сынам вяльможы ехала «служба», якая яго суправаджала. У яе ліку была і маладая, больш бедная, шляхта.

Ва універсітэты паступалі таксама самастойна прыбыўшыя туды дзеці дваран і гараджан (апошнія, як правіла, вучыліся лепш). Ім даводзілася разлічваць не на становішча і багацце сваіх бацькоў, а толькі на свае сілы. Праўда, такіх студэнтаў было не надта шмат.

Асобныя маладыя людзі ў пошуках ведаў пераехалі з аднаго універсітэта ў другі. У спіс студэнтаў Вітэнбергскага універсітэта 17 чэрвеня 1573 года быў запісаны «Блазіус Грэндаў літовец». Ён жа ўпамянуты ў запісе 1580 года ў ліку студэнтаў Іенскага універсітэта (пад імем «Грандау. Базіл(іус) Гротнен(зіс)» і ў запісе тых жа гадоў універсітэта ў Франкфурце-на-Одэры як «Грандоў Блаз(іус)». Гэта, несумненна, адна і тая ж асоба— Васіль Грэндаў (а можа быць, Грандзіч?) з Гродна ці Грандзічаў (паселішча пад Гродна).

Ад'езд ураджэнцаў Беларусі для абучэння ў Заходнюю і Цэнтральную Еўропу кампенсаваўся прыездам адтуль урачоў. Немалая колькасць універсітэтаў і значная колькасць выпускнікоў выклікалі своеасаблівы адток іх у Вялікае княства Літоўскае, дзе на іх быў попыт. Беларусі і Літве патрэбны былі культурныя сілы. Італія, Швейцарыя, Германія прапаноўвалі іх. У нашых краях выхадцы з іншых краін знаходзілі спрыяльныя ўмовы для работы, як аб гэтым сведчаць прыклады паспяховай дзейнасці тут Дж. А. Валенціна (асабістага ўрача вялікай князёўны Боны з дома Сфорца), Дж. Бьяндраты, П. Сімоні, Н. Бучэлы, І. Гаслера, Д. Набароўскага і І. Дэльмедзіга.

**Валянцін ГРЫЦКЕВІЧ.**

**(Заканчэнне будзе).**

## крынічка

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

# БУРЫК

## З АПАВЯДАННЯ «БЫЛІ У МЯНЕ МЯДЗВЕДЗІ»



**[Заканчэнне. Пачатак у № 50 за 1988 год].**

ТАК МЫ пражылі лета. А за ім прыйшла восень з яе жалудамі і брусніцамі. І зноў засерабрыўся дах пуні, а Бурык стаў вялы і сонны і не хацеў гуляць са мной.

Адразу за нашай хатай ужо з год ляжала яліна-выварацень. Ніяк не даходзілі рукі распілаваць яе. А пасля бацька забараніў. Таму што ў яму пад каранямі нанесла шмат сухой лістоты, і аднойчы ён убачыў, як Бурык залез у гэтую яму і топчацца, і топчацца там. Бацька загадаў мне кожны дзень, як прыйду са школы, награбаць граблямі два мяхі сухой лістоты і высыпаць туды.

Пасля лістота стала мокрая, пасля змерзлая, жорсткая, як шкляная, аж звінела, а Бурык пачаў часцей і часцей знікаць. Спачатку на дзень, пасля на дзень і ноч...

Паваліў, паваліў снег, засыпаў нашу сядзібу, пуні, яліны ў лесе, стагі і ядлоўцавыя хмызы. Уставалі і клаліся пры газавых лямпах. Вечарамі сталі грубкі, і зменлівы, бягучы водбліск бегаў па старонках кнігі. І мне было шкада, што за сцяной, не так ужо і далёка, спіць у снезе мой звер. Хаця я ведаў, што ён добра ўпасвены, а ўкормленаму лёгка перажыць зіму.

БУРЫК устаў, калі снегу было ўжо куды менш, чым зямлі. Увесь нейкі нібы аблезлы, з праваленымі бакамі, з вострай, нібы ў беспароднай свінні, мордай. Я не бачыў, як ён устаў. Толькі разрыты лаз пуста глядзеў. На ўсход, як заўсёды ў мядзведзяў. Бацька супакоіў, што ён не ўцячэ, што гэта ён проста пайшоў пагрызці крушынавай кары ці яшчэ чагосьці.

І сапраўды, на трэці дзень ён з'явіўся, крыху больш здзічэлы, але ўсё яшчэ свой. Мы далі яму хлеба, уціснуўшы ў бохан драбкі цукру, і ён захрубусцеў, як раней.

Цяпер ён часам знікаў на дзень, а то й на два, але заўсёды прыходзіў і канючыў ежу, бо ў лесе яе было яшчэ мала. Але паступова ўсё больш прыгравала сонца, сонечна закалыхалася між дрэў мора заечай капусты, выпаўзлі мурашкі, пярэстымі, як у фіялкі, падкоўкамі лістоў рассыпаліся пад ярамі падалешнікі. Ежы стала болей, і ён еў і ў лесе, і ў нас.

Сярод усіх людзей ён па-ранейшаму адзначаў мяне. Нават узяў прывычку праводзіць мяне ў школу. Да ўзлесся. Страшэнна падрос. Калі ставаў на заднія лапы, быў ужо вышэйшы за мяне, і мне забаранілі дужацца з ім, бо ён у запале можа не суразмерыць сілы.

Пэўна, не адзін чалавек шчыкаў тады сябе за руку, убачыўшы, як купаюцца ў Водры або разам выходзяць на адхон хлопчык і мядзведзь, якога хлопчык вядзе за вуха.

Аднойчы ён да паўсмерці спалохаў нейкіх баб, што збіралі для аптэкі познія смаржкі і розныя зёлкі. І тады, каб не цягаўся за мной, вырашылі садзіць яго на ланцуг на тую гадзіну, што патрабавалася мне, каб дайсці да школы

Тут і я зразумеў, што азначае ланцуг, калі выходзіў з лясніцтва, і неасцярожна азірнуўся, і ўбачыў ягоныя вочы і тое, як ён стаіць дыбкі і перамінаецца, і пераліваецца яго сытае, святлейшае колерам, пуза. І як ён цягне тоўстыя лапы. Не дай вам бог бачыць гэта, калі вы любіце звяроў і людзей!

І тут здарылася тое, што прыскорыла нашу з ім разлуку.

Калі я адыходзіў, Бурык звычайна ляжаў, безнадзейна паклаўшы галаву на лапы. Я аглядаўся, бачыў яго, наш двор, засыпаны жвірам, бэльку, што падпірала сцяну лядаштай пуні, і матку, якая стаяла на ганку, сыпала з рэшата зерне і клікала:

— Пылі-пылі-пылі-пылі!

Курэй у нас было шмат. І вось куры пачалі знікаць. Спачатку думалі: ліса. І толькі потым выявілі за сабачай будкай цэлыя курыныя могілкі. А пасля ўдалося падсачыць, як гэты паскуднік Бурык зграбае жвір, устае на заднія лапы і паволі высыпае яго з пярэдніх. Няма птушкі, дурнейшай за курыцу. Тыя падыходзілі, і тут мядзведзь, цвёрда ведаючы, наколькі дазволіць яму гэта ланцуг, рабіў кідок і жыва скручваў курыцы вязы. А пасля закопваў за будкай...

— Звярэе, — сказаў бацька.— Ну, Сяргей, хочаш не хочаш, а час развітвацца.

ВЫРАШЫЛІ адвезці яго ў пятніцу, а ў чацвер здарылася тое , пра што бацька казаў, збялеўшы: «Ну, пашанцавала».

Я пайшоў у школу, а хвілін праз дваццаць Бурыку ўдалося сцягнуць з сябе нашыйнік. Ці то зацягнулі не на тую дзірку, ці яшчэ што, але ён круціў-круціў галавою дый вызваліўся. А вызваліўшыся, кінуўся даганяць мяне. Як адчуваў, што гэта апошні паход... Узлесся толькі-толькі засвяціла наперадзе сонцам праз дрэвы, як я, азірнуўшыся, убачыў белы ажаролак з клінам наперадзе і мехаваты зад, які матляўся з боку ў бок, і лапы, якія ён нязграбна выкідаў наперад.

Дагнаў і захукаў, засоп, забурчаў. І я вырашыў, што дазволю яму апошні раз давесці мяне да ўзгорка. Паклаў руку яму на загорбак і так, злёгку абапіраючыся, пайшоў далей. Так мы адышлі далёка ад лесу, калі я ўбачыў...

...Я не ведаў, што ў той дзень удалося вызваліцца не толькі аднаму Бурыку, што ў той дзень выкруціў з ноздраў кольца яшчэ й саўгасны бугай Гром. Проста выпаў вінт, яно распалася на два паўмесяцы ў выглядзе лацінскага «С», і Гром датуль цёр пысай аб траву, пакуль не пазбавіўся ад адзінай рэчы, якой можна ўтаймаваць бугая, кольца, трымаючыся за якое, нават сямігадовае дзіця можа весці жывёліну, куды захоча.

Мой траюрадны брат Алік, сын дырэктара школы, і яшчэ два хлопцы пагналіся за ашалелай жывёлінай. Да таго часу Гром паспеў перакінуць на рогах цераз высокі хмыз пастуха, зламаўшы яму пяць рэбраў. Ад смерці таго ўратавала толькі тое, што бык, дзякуючы хмызу, згубіў чалавека з вачэй... І вось тры коннікі, сцёбаючы пугамі, дзве гадзіны ганялі быка, пакуль не загналі ў пустое гумно. Ім удалося зачыніць усе трое варот. Брат забраўся на бэльку, завязаў на ёй тоўстую вяроўку і пачаў спускаць другі яе канец, з бягучай пятлёй, туды, дзе соп, рыкаў і пароў паветра страшнымі рогамі бугай.

Брату пашанцавала закінуць пятлю на гэтыя рогі і зацягнуць яе, але тут звер, адчуўшы няволю, таргануўся, кінуўся наперад, і таўшчэзная вяроўка толькі дзынкнула, як перацягнутая струна. Брат, які ўсё яшчэ трымаўся за яе, ад рыўка не ўтрымаўся і ляснуўся з бэлькі проста пад капыты пачвары. На шчасце, бугай не зразумеў, што да чаго, і, не звярнуўшы на яго ўвагі, рынуўся наперад, высадзіў рогамі вароты і кінуўся бегчы.

КАЛІ я ўбачыў, як наперадзе паўстала воблака пылу, і, матляючы галавой, каб скінуць з рогаў пятлю, падскокваючы на ўсіх чатырох і дугой выгнуўшы над зямлёй хвост, імчыць на мяне вялізная, як зубр, чырвоная пачвара швейцарскай пароды, зразумеў: уцякаць не было куды. Ад лесу я адышоў далёка. І вакол хаця б кусцік, хаця б яміна.

Я не спалохаўся тады. Проста ўсё ўва мне нібы скамянела. Бугай спыніўся: заўважыў. Налітыя крывёй вочы глядзелі на мяне, пена валіла з пысы. Ён рыў капытамі зямлю і напружваўся. І ўсё ніжэй апускаліся вострыя і бліскучыя, нібы паліраваныя, канцы рогаў.

Кінуўся з дзікім рыкам.

Я паспеў адскочыць. І яшчэ раз адскочыць. І яшчэ. Доўга такая гульня цягнуцца не магла. Ногі ў мяне пачалі павольна млець. І тут, калі Гром чацвёрты раз кінуўся на мяне, з нечаканай хуткасцю мятнуўся на яго збоку, здавалася б, такі нязграбны, буры цень.

Бурык адвесіў цяжкай лапай удар па загорбку пачвары і раздзёр яго. Але нават не рана прывяла Грома ў прытомнасць. Ён урэшце заўважыў мядзведзя, зразумеў, з кім мае справу, адчуўшы ненавісны і страшны, дзікі, звярыны, лясны пах.

...Калі ўрэшцэ падскакалі коннікі, Гром адступаў, дрыжучы ад нянавісці і жаху, задкаваў, усё яшчэ капыцячы зямлю, але ўжо не асмельваючыся рынуцца наперад. Нізка рыкаў і адступаў перад зверам, які на задніх лапах наступаў на яго. Бугаю накінулі на рогі і на заднюю нагу распетлі і павялі. Бурык ішоў ззаду, як канваір, і давёў усю гэту мілую кампанію да кузні, дзе Грому зноў укруцілі кольца.

...Маці дазволіла адвезці мядзведзя толькі ў нядзелю, усе тры дні адкормлівала яго, як кабана, і калі мы вялі Бурыка ў машыну, цалавала яго ў морду і плакала.

Звера завялі па сходцах у кузаў. Бацька і я селі побач. Марка — у кабіне з шафёрам. Мядзведзь устрывожыўся было, калі затурчаў матор, але хутка супакоіўся. Глядзеў маленькімі вочкамі, як плылі назад лясы, і бліскучая, нібы цыратовая цюпка ягонага носа рухалася: чытаў баравыя пахі. Мне было да болю шкада расставацца, але я разумеў, што мядзведзя майго цягне да сябе падобных і яму там будзе лепей, чым сярод нас. Усё ж ён быў народжаны для свабоды.

Мы адвезлі яго за пяцьдзесят кіламетраў, у самы глухі кут, дзе найчасцей сустракалі мядзведзяў, выпусцілі, агладзілі яго і пайшлі да машыны. Некалькі разоў ён імкнуўся быў за намі, але пахі першабытнага лесу перамагалі, і ён усё аддаляўся. Бацька і Марка ўбачылі, як ён праводзіць нас позіркам, і далі ў паветра некалькі стрэлаў. Тады ён пабег трушком і знік сярод дрэў.

...Праз некалькі тыдняў немцы бамбілі гарадок. Першыя бомбы трапілі ў пошту, універмаг, тэатр. Палясоўшчыкі казалі, што звяры скопам перакачоўваюць ад шуму і ад дарог у нетры лясоў. І адзіным слабым суцяшэннем сярод усеагульнага гора мне было тое, што звер, якога я любіў і які ўратаваў мне жыццё, цяпер напэўна не пойдзе да дарог, на якіх выбухаюць бомбы і гудуць танкі, над якімі праносяцца на брыючым самалёты.

На другім тыдні вайны мы ўсе пайшлі ў лес.

...Восенню сорак другога года мы з дзедам Маркам прабіраліся лясамі на сувязь. Абодва ў кужалі і шарачку, абодва з торбамі. Марка, што адпусціў сівую бараду, сапраўды быў падобны на старца, а я быў у яго павадыром. У нас і «легенда» была някепская. Бацька з маці «загінулі ад бомбы, а Марка, шкадуючы, падабраў мяне». Прыдрацца не было да чаго.

Лес быў увесь засыпаны звонкай сухой лістотай, залатой, іржавай, чырвонай, вішнёвай. Яна шастала пад нагамі і аж звінела, калі праносіўся подых ветру: мільёны лімонных і вінных матылёў узляталі ў паветра і мільгалі між дрэў.

І вось калі мы падыходзілі да яра ў вярхоўях Водры (з яра якраз выбівалася крынічка, што ўпадала ў яе), Марка раптам паклаў мне на плячо руку і спыніў.

Яр быў ледзь не па самы верх засыпаны лістотай. Зрабі крок — і ўтонеш. І дрэвы ўсё дабаўлялі і дабаўлялі ў яго золата і чырвані. І, мабыць, гэты шолах даў нам магчымасць падысці непачутымі так блізка.

На тым беразе адвальваў тоўстую, зялёную ад моху калоду магутны буры мядзведзь. Віслы зад, страшныя крывавата пярэднія лапы, куды таўсцейшыя за заднія. І нават адсюль было відаць, як пераліваюцца мускулы на вялізным падвойным загорбку.

Калі ён адваліў калоду, сеў і пачаў выбіраць з-пад яе нешта і чамкаць, я ўбачыў белы ажаролак, і радасць гарачай хваляй абліла маё сэрца: «Няўжо ён? Ой, не ён. Ой, вядома ж, ён!»

— Бурык! Бурчынька! — шэптам паклікаў я.

Марка паклаў мне далонь на вусны. А мядзведзь насцеражыўся, і сеў, і стаў паводзіць сваёй цюпкай, і зыркаць ва ўсе бакі. Але паветра веяла ад яго на нас і заўважыць нас ён не мог (мядзведзі кепскавата бачаць). І я маўчаў. Тады ён вытаргнуў, як мне здалося, амаль прызыўнае крактанне. Ласкавае, жаласнае, падобнае на мурканне. Ці, можа, я хацеў у гэта верыць?

Мы маўчалі, і паступова ён супакоіўся, даеў тое, пад калодай, і павольна, перавальваючыся, завалюхаў у нетры. Павеў ветру ўзняў між ім і намі чырвона-залатую сецьва. Пасля лістота пасыпалася з урвішча на дно яра. Мяккім хвалістым вадаспадам. І лісце нібы празвінела наўздагон яму. А пасля стала ціха.

Мінула вайна. Я даўно скончыў мастацкі інстытут, і даўно працаваў, і дабіўся вядомасці. Калі часам даводзілася ўспамінаць пра тыя дні, я пераконваў сябе, што звер мой стаў мацёрым магутным мядзведзем, «дзедам» і «прадзедам», патрыярхам вялікай мядзведжай сям'і, і мірна заснуў ад старасці недзе на сонечным укрытым кветкамі схіле.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63854. Зак. 138